# ПОДЗВІГ ЮНЫХ СЭРЦАЎ

## *Выстаўка пра маладых герояў вайны працуе ў галерэі «Універсітэт культуры»*

**Летапіс Вялікай Айчыннай вайны напісаны трагічнымі лёсамі цэлага пакалення. Асабліва кранаюць заўсёды гісторыі дзяцей — сведкаў і ўдзельнікаў жудасных падзей, сыноў і дачок палка, чые подзвігі назаўжды засталіся ў памяці народа. У іх гонар у мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» працуе дакументальная фотавыстаўка «Юныя абаронцы Радзімы».**

Вайна ўварвалася ў жыццё савецкага народа і нікога не пакінула абыякавым. Кожны грамадзянін лічыў сваім абавязкам выступіць супраць фашысцкага рэжыму, не гледзячы на розныя жыццёвыя абмежаванні. Дзеці вайны выраслі вельмі рана. Іх дзяцінства, абпаленае народнай трагедыяй, скончылася ў чэрвені 1941 года. І гэта пакінула вечны след на сэрцы пакалення, якое ўступіла ў дарослае жыццё з попелам замест цацак.

Па розных ацэнках, у Вялікай Айчыннай вайне ўдзельнічала больш за 400 тысяч дзяцей і падлеткаў дапрызыўнага ўзросту. Гэта былі выхаванцы баявых падраздзяленняў, партызаны, падпольшчыкі, юнгі, медыцынскія сёстры, разведчыкі. Падчас баёў юныя героі ахвяравалі жыццём таксама, як і вопытныя байцы. Іх унёсак у Вялікую Перамогу не абмяжоўваецца подзвігамі на полі бою — яны працавалі ў тыле, дапамагалі забеспячэнню войскаў і інш.

У экспазіцыі прадстаўлены дакументальныя і фотаматэрыялы пра лёсы дзяцей, якія апынуліся ў самым эпіцэнтры трагедыі. Успаміны юных удзельнікаў вайны адлюстраваны праз унікальныя фотаздымкі, радкі з лістоў і вершаў. Наведвальнікі галерэі могуць пазнаёміцца з гісторыямі дзяцей-герояў — Валодзі Дубініна, Віці Карабкова, Вані Грышакова, Эрыка Лукьянава, Віталіка Чыжыкава, Аркадзя Каманіна, Дзмітрыя Астрыкава, Сашы Капылова, Вані Кузняцова, Веры Конінай і іншых. Некаторыя дачакаліся светлага дня Перамогі, а хтосьці назаўсёды застаўся на полі бою. Гісторыі подзвігаў юных герояў, якія бачым у экспазіцыі, сталі асновай для шматлікіх літаратурных твораў.



*Наталля Сінельнікава «Дачакаліся!»*

Так, напрыклад, подзвігу Уладзіміра Дубініна, удзельніку партызанскага атрада імя І. В. Сталіна, прысвечана аповесць Льва Касіля «Вуліца малодшага сына».

Акрамя дакументальных звестак на выстаўцы дэманструюцца жывапісныя работы юных мастакоў з розных рэгіёнаў Расіі. Сюжэтамі для твораў сталі гераічныя подзвігі, якія здзейснілі іх равеснікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Большасць работ — партрэтны жывапіс, а таксама батальныя эпізоды.

Як адзначаюць арганізатары, выстаўка адлюстроўвае значны ўнёсак дзяцей у перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі і накіравана на фарміраванне гістарычнай памяці і патрыятычнае выхаванне дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. Экспазіцыя не толькі расказвае пра гераізм юных абаронцаў Айчыны, але і паказвае, што мужнасць, самаахвярнасць і вера ў перамогу не маюць узроставых межаў.

Праект арганізаваны сумесна з Расійскім ваенна-гістарычным таварыствам пры садзейнічанні прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Выстаўка працуе да 28 ліпеня.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**